для запоминания ими написания того или иного объекта, чтобы при необходимости они могли использовать его в своей работе [9, с. 206–208]. Необходимость запоминания названия Эсагилы указывает на возможность его использования в ежедневной писцовой деятельности, на возможность существования иных документов старовавилонского периода, касающихся храма, которые просто до нас не дошли или еще не найдены.

**Литература**


1. *Бартош В.* Появление бога Мардука, его города Вавилона и храма Эсагила // Лістападаўскія сустрэчы-8, Мн., 2011. С. 14–26.
2. *George A. R.* Babylonian Topographical Texts. Leuven, 1992.
3. *George A. R.* House Most High. The Temples of Ancient Mesopotamia. Winona Lake, Indiana, 1993.
4. *Horsnell M.* The Year-Names of the First Dynasty of Babylon. V. I. McMaster University Press, 1999.
5. Mesopotamian Year Names. Neo-Sumerian and Old Babylonian Date Formulae. Prepared by Marcel Sigrist and Peter Damerow // Цит. по: http://cdli.ucla.edu/tools/yearnames/yearnames.htm.
6. *Roth M. T.* Law Collections from Mesopotamia and Asia Minor. Atlanta, 1997.
7. *Harris R.* On the Process of Secularization under Hammurabi / Harris. R. – Journal of Cuneiform Studies Vol. 15, No. 4 (1961). P. 117–120.
8. Materials for Sumerian Lexicon XIII. Izi = *išātu*, Ká-gal = *abullu* and Níg-ga = *makkūru*. Roma, 1971.
9. *Veldhuis N.* A Late Old Babylonian Proto-Kagal/Nigga Text and the Nature of the Acrographic Lexical Series // *Acta Sumerologica* 20 C. 201–216.


## УРАДАВАЯ ПАЛІТЫКА ПА АДНОСІНАХ ДА ЗЕМЛЕЎЛАСНІКАЎ-КАТАЛІКОЎ У 1860-1870-ых гг.

**А. Р. Лудзіч**

Паражэнне паўстання 1863–1864 гг. прывяло да пагаршэння становішча ў паўночна-заходніх губернях: было ўведзена ваеннае палажэнне, Мінская, Вітебская і Магілёўская губерніі далучаны да Віленскага генерал-губернатарства, асноўныя законы – надзвычайныя цыркуляры і распаражэнні, паўсюдна дзейнічалі ваенна-палявыя суды і следчыя камісіі [5, с. 31].

Так як расійскі ўрад палічыў польскіх памешчыкаў як галоўных дзяечаў паўстання, то рэпрэсіраваннымі, сталі менавіта яны. Па прыгаворах ваенна-палявых судоў было выслана з краю 1764 памешчыкаў-каталікоў (без шляхты) і ксяндзоў, якія склалі 67% ад агульнай колькасці высланных [7, с. 49]. Найбольшыя страты панеслі памешчыкі "польскага паходжання" Гродзенскай губерні, дзе з 1863 па 1867 г. іх колькасць паменшылася ў тры разы.

Далейшая палітыка мясцовых улад была накіравана на паслабленне палітычнага ўплыву мясцовых землеўласнікаў. Былі скасаваны дваранскія сходы; мясцовых прадвадзіцеляў дваранства замянілі на царскіх стаўленнікаў, якія нават не мелі зямельнай маёмасці ў краі. На маёнткі землеўласнікаў-каталікоў быў уведзены т. зв. кантыбуцыйны збор роўны 10 % даходаў. Таксама шырока злоўжываліся мясцовай адміністрацыяй шматлікія нерэгламентаваныя штрафы, маёмасць асуджанных канфіскавалася.

Каб гарантаваць бяспеку пры правядзенні аграрнай рэформы 1861 г., расійскія ўлады вырашылі выдаліць з мясцовага апарату кіравання "неблаганадзейныя элементы", у дадзеным выпадку памешчыкаў-каталікоў. Звальняючы міравых пасрэднікаў "польскага паходжання" і чыноўнікаў-палякаў, самадзяржаўе спадзявалася пазбавіць іх магчымасці паўплываць на ход сялянскай рэформы.

Віленскі генерал-губернатар М.М. Мураўёў у адносінах да польскага дваранства прытрымліваўся двух асноўных прыцыпаў: "ніякага прымірэння з палякамі" і "паляка неабходна караць рублём і трымаць у страху". [3, с. 54] Цыркуляр Мураўёва забараніў памешчыкам-каталікам адыходзіць ад сваіх месцаў пражывання, збірацца па некалькі чалавек без згоды мясовых улад, забаронена карыстацца польскай мовай і сімваламі у грамадскіх месцах і афіцыяльных дакументах [3, с. 97].

З рук землеўласнікаў-каталікоў былі канфіскаваны маёнткі, ўласнікі якіх прынялі ўдзел у паўстанні. Па дадзеным генерал-губернатара М. М. Мураўёва ў перыяд 1864–1866 гг. у пяці заходніх губернях у казну было канфіскавана 256 маёнткаў. Канфіскаваныя маёнткі планавалася прадаць на публічных таргах. Аляксандрам II 10 снежня 1865 г. быў зацверджаны новы закон, па якому "асобам польскага паходжання" забаранялася набываць новыя землі ў Паўночна-Заходнім краі, ўсім высланым прапанавалася на працягу двух гадоў прадаць або абмяняць маёнткі па коштах, якія задавальнялі іх саміх. [4, № 16295] Калі гэтага не будзе зроблена, то маёнткі падлягалі продажу на публічных таргах.

Палажэнне 10 снежня 1865 г. з'яўлялася асноўным законам, накіраванным супраць каталіцкага памешчыцкага землеваладання ў Паўночна-заходнім краі. Самадзяржаўе, абапіраючыся на гэтае палажэнне, імкнулася ў бліжэйшыя гады скараціць польскае землеваладанне за кошт абавязковага продажу маёнткаў высланных, а ў будучым планавалася перашкаджаць росту зямельнай плошчы, якая знаходзілася ў іх маёмасці.

Рост народніцкага руху ў 1860-ых гг., сялянскі выступленні прывялі да перагляду адносін "асоб польскага паходжання" з самадзяржаўем. яны бачылі гарантыю зберагчы свае прывелегіі і панаванне ў непахіснасці самадзяржаўя. Таму і відавочна зацікаўленасць двух бакоў

у супрацоўніцтве. Магілёўскі губернатар дакладваў у 1866 г: “Большасць дваранства польскага паходжання асуджаюць падзеі паўстання 1863–1864 гг… яны разачараваны ў барацьбе за незалежнасць Польшчы” [5, с. 61].

Лібералізацыя ўрадавага курса ў дачыненні да іх праглядваецца ў пазіцыі міністра ўнутраных спраў П. А. Валуева. Міністр паказаў на адсутнасць падстаў да недаверу каталікам: “Што палітыка неапраўданага абмежавання і рэпрэсій, накіраваная на ўсё польскае дваранства, адштурховае магчымых саюзнікаў, бянтэжыць усё каталіцкае насельніцтва і павялічвае колькасць незадаволеных” [1].

Палітыка самадзяржаўя змяніла курс і была накіравана на пошук польскіх памешчыкаў, якія былі гатовы супрацоўнічаць з царызмам. Новы віленскі генерал-губернатар А. Л. Патапаў крытыкаваў палітыку М. М. Мураўёва і прапанаваў у 1865 г. наступную пазіцыю: “Благанадзейным польскім памешчыкам ўрад павінен аказаць заступніцтва і падтрымку, як і рускім дваранам, вызваляючы край ад небяспечных для самадзяржаўя “элементаў”. А польскае дваранства будзе апорай ўрада і прасоўваць яго ідэі ў народ…” [1].

Памешчыкам “польскага паходжання” мясцовая адміністрацыя пайшла на наступныя саступкі: у 1869 г. у Магілёўскай і Віцебскай губерніі, у 1870 – у Мінскай было адменена ваеннае палажэнне, якое перашкаджала паспяховаму вядзенню гаспадаркі, мясцовыя ўлады вызвалялі “надзейных палякаў” ад кантрыбуцыйных збораў [5, с. 79].

Так як палажэнне ад 10 снежня 1865 г. забараняла “польскім элементам” купляць і браць маёнткі ў арэнду, з’яўлялася перашкодай у супрацоўніцтве землеўласнікаў-каталікоў і расійскіх улад. Тады самі мясцовыя улады парушалі закон і дазвалялі куплю і арэнду зямлі.

Былі палегчаны прыгаворы многім асуджаным памешчыкам за ўдзел у паўстанні. У 1867 г. спынены ўсе няскочаныя справы па ўдзельнікам паўстання, высланым паўстанцам дазвалялася вярнуцца, але толькі ў Царства Польскае [1]. Ваенна-палявыя суды былі скасаваны, а віленскі генерал-губернатар А. Л. Патапаў асабіста вызваліў каля 1500 падозраных асоб з ліку памешчыкаў-каталікоў [2].

Важнай палітычнай саступкай была замена прадвадзіцелй дваранства назначаных губернатарам, на мясцовых памешчыкаў. Стаўшы на чале дваранскіх сходаў памешчыкі “польскага паходжання” прадстаўлялі і абаранялі інтарэсы. Праз “сваіх” прадвадзіцелей дваранства, якія “прымалі ўдзелу кіраванні дзяржавай”, яны мелі магчымасць уплываць на ўрад і яго палітыку.

Віленскі генерал-губернатар А. Л. Патапаў адзначае: “Прадвадзіцелі дваранства польскага паходжання і каталіцакага веравызнання не толькі не паказалі ніводных падстаў з нашага боку прэтэнзій або сумневаў у іх

адданасці самадзяржаўю, але і былі адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі. Таму дазваляю кіраўнікам мясцовых огранаў улады па правілу выключэння прызначаць на пасады надзейных у палітычным плане польскіх землеўласнікаў”[5, с. 81]. У выніку, больш паловы ўсіх павятовых прадвадзіцелей дваранства былі каталікамі, прытым перавага аддавалася з ліку найбольш заможных і ўплывовых [6, с. 48].

Толькі ў адной пазіцыі царызм не пажадаў саступаць эліце польскай грамадскасці – гэта кіраванне ў земствах, якія планавалася стварыць згодна з Земскай рэформай 1864 г. бо ўсімі справамі ў гэтых установах займаліся б памешчыкі-каталікі, валодаўшыя ўстаноўленным адукацыйным і маёмасным цэнзам. Пагэтаму і ўрад прыняў рашэнне не ўводзіць земствы ў заходніх губернях і не аднаўляць працу дваранскіх сходаў і т.д.

Такім чынам, расля разгрому паўстання 1863–1864 гг. палітыка расійскіх уладаў  адыйшла ад курсу дзяржаўнай асіміляцыі польскай грамадскасці і ўніфікацыю Паўночна-Заходняга краю да спробы поўнай дэпаланізацыі і імкнення забяспечыць поўнае дамінаванне т. зв. “рускага элемента” у палітычным і нацыянальна-культурным жыцці. У першую чаргу гэты наступ быў накіраванны на найбольш актыўную і небяспечную для самадзяржаўя частку насельніцтва краю – землеўласнікаў-каталікоў.

Аднак самадзяржаўю проста не хапіла неабходнага патэнцыялу для вырашэння “польскай праблемы”. Тлумачацца няўдачы расійскага ўраду іх непаслядоўнасцю і хістаннем: за паліцэйска-бюрактратычнымі рэпрэсіямі ці “мураўёўскім падыходам” наступала хваля лібералізму і супрацоўніцтва. Прычыны, па якіх самадзяржаўе ішло на супра-цоўніцтва з “асобамі польскага паходжання”, тлумачацца неабходнасцю пошуку падтрымкі збоку мясцовага насельніцтва, змяншэнні колькасці апазіцыйных настрояў.

**Літаратура**


1. Виленский вестник. 1868, №10.
2. Виленский вестник. 1870. №26.
3. *Петров К. В.* Материалы о графе М. Н. Муравьеве-Виленском. Редкол. Е. В. Никонорова, И. П. Донскова, Л. Н. Тихонова. Румянцевские чтения: материалы международной конференции (5–7 апреля 2005). М., 2005. С. 54.
4. Полное собрание законов Российской империи. 2 собр. Т. 40. № 16295.
5. *Самбук С. М.* Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1980.
6. *Jurkowski R.* Ziemiaństwo polskie kresów Północno-wschodnich 1864–1904. Warszawa, 2001.
7. *Ustrzycki M.* Ziemianie Polscy na Kresach 1864–1914. Warszawa, 2003. S. 480.

8. *Wapinski R.* Miejsce ziem wschodnich Rzeczypospolitej przedrozbiorowej w polskiej świadomości politycznej lat 1864–1918. S. 49.

# «МИНСКИЕ ГУБЕРНСКИЕ ВЕДОМОСТИ» В ПЕРИОД ВОССТАНИЯ 1863–1864 гг.

**Е. Г. Луферчик**

«Губернским ведомостям» принадлежит особая роль в процессе формирования легальной периодической печати не только в Минской губернии, но и во всей Российской империи. Благодаря их изданию, начатому еще в 1838 г., был заложен фундамент для развития системы белорусской журналистики. Газета способствовала становлению и развитию провинциальной интеллигенции, аккумулировала ее творче-ский потенциал, не только отражала, но и формировала общественное мнение.

10 января 1863 г. [1] в Варшаве началось восстание, получившее название Январского. В этот день польский Центральный национальный комитет опубликовал воззвание, в котором призывал население к оружию и объявлял «всех сынов Польши без различия веры, племени, происхождения и сословия» свободными и равноправными гражданами [2]. В течение десяти дней Литовский провинциальный комитет издал свои манифесты, в которых соглашался с программными документами Центрального комитета и призывал население западных губерний поддержать восстание [3]. Восстание охватило территории Царства Польского, литовско-белорусских и украинских губерний Российской империи.

Цель статьи – проанализировать содержание «Минских губернских ведомостей» в период восстания 1863–1864 гг., определить их роль в информировании населения губернии и формировании общественного мнения, выявить функции, которые выполняла газета в процессе сдерживания и подавления восстания в регионе. Для достижения цели было изучено 102 из 104 номеров газеты за 1863–1864 гг., хранящиеся в библиотечном зале Национального исторического архива Беларуси. В подшивке газет отсутствуют № 25 от 21 июня 1863 г. и № 37 от 11 сентября 1864 г., а №№ 27, 28 и 45 за 1864 г. представлены без неофициальной части второго отдела.

В качестве объекта исследования нас интересовали любые публикации (сообщения о «высочайших постановлениях», правитель-ственные указы, объявления и извещения губернского правления, «всеподданнейшие письма», публицистические статьи, местная кор-респонденция, «перепечатки» и пр.), в которых тем или иным образом затрагивалась проблематика восстания 1863–1864 гг. Число таких публикаций в рассматриваемый период составило около ста.